МІНСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ
ПА АДУКАЦЫІ

МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ
ПО ОБРАЗОВАНИЮ

ЗАГАД

ПРИКАЗ

07.10.2026 № 525

г. Мінск

г. Минск

Аб зацвярджэнні Палажэнняў

На падставе Палажэння аб галоўным упраўленні па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, зацверджаным рашэннем Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад 30.05.2018 № 448 (у рэдакцыі рашэння Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад 23.03.2026 № 348),
ЗАГАДВАЮ:

1. Зацвердзіць Палажэнне аб Ганаровай грамаце галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (прыкладаецца).

2. Зацвердзіць Палажэнне аб аб'яўленні Падзякі начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (прыкладаецца).

3. Лічыць страціўшым сілу загад начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад 15.08.2019 № 393.

4. Кантроль за выкананнем загаду ўскласці на першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Філістовіч С.П.

Начальнік М.М.Башко

Пратасавіцкая 500 42 27

ЗАЦВЕРДЖАНА
загад начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама
«25» 10. 2016 № 525

ПАЛАЖЭННЕ
аб Ганаровай грамаце галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта

1. Ганаровая грамата галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (далей – Ганаровая грамата) з'яўляецца формай маральнага заахвочвання калектываў і работнікаў устаноў адукацыі Мінскай вобласці, работнікаў органаў дзяржаўнага кіравання мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (далей – дзяржаўныя органы) і іншых арганізацый.

2. Ганаровай граматай узнагароджваюцца за:

абагульненне, распаўсюджванне і актыўнае прымяненне перадавога вопыту ў галіне адукацыі, забеспячэнне высокай якасці навучання і выхавання дзяцей і моладзі;

дасягненні ў навуковай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці;

актыўную грамадзянскую і патрыятычную пазіцыю;

поспехі, дасягнутыя ў арганізацыі адукацыйнага працэсу, культурна-масавай, аздараўленчай, фізкультурна-аздараўленчай рабоце, патрыятычным і грамадзянскім выхаванні дзяцей і моладзі ва ўстановах адукацыі і іншых арганізацыях;

паспяховую работу па ўдасканаленні і ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, аснашчэнні вучэбных кабінетаў, майстэрняў, лабараторый;

поспехі навучэнскай моладзі ў вучэбнай, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай дзейнасці, а таксама ў тэхнічным, мастацкім, экалагічным, турысцкім напрамках дадатковай адукацыі, удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, фестывалях, канферэнцыях, сімпозіумах, кангрэсах, семінарах і іншых адукацыйных мерапрыемствах;

удзел у рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў "Настаўнік года Рэспублікі Беларусь", рэспубліканскага фестывалю "Педагагічны дэбют" і іншых конкурсах прафесійнага майстэрства;

высокія паказчыкі ў рабоце, паспяховае выкананне задач, якія стаяць перад сістэмай адукацыі;

узорнае выкананне службовых (працоўных) абавязкаў;

за іншыя заслугі.

3. Ганаровай граматай могуць узнагароджвацца калектывы і работнікі ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці, работнікі дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый іншых ведамстваў, якія на працягу многіх гадоў прымалі актыўны ўдзел у навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення, прафілактычнай рабоце з дзецьмі і моладдзю, умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, развіцці сістэмы адукацыі Мінскай вобласці.

Ганаровай граматай, як правіла, работнікі ўзнагароджваюцца не раней чым праз два гады з дня папярэдняга ўзнагароджання.

4. Рашэнне аб узнагароджанні Ганаровай граматай прымаецца начальнікам галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама (далей – начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі) на падставе прадстаўлення.

Узнагароджанне Ганаровай граматай можа ініцыяваць начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі, намеснікі начальніка, кіраўнікі структурных падраздзяленняў галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама (далей – галоўнага ўпраўлення па адукацыі).

5. У галоўнае ўпраўленне па адукацыі накіроўваецца пісьмо на імя начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі з абгрунтаваннем неабходнасці ўзнагароджання, прадстаўленне згодна з Дадаткам 1. Пісьмо падпісваецца начальнікам упраўлення па адукацыі райвыканкама, упраўлення (аддзела) па адукацыі і спорце райгарвыканкама, кіраўніком установы адукацыі абласнога падпарадкавання, а ў іх адсутнасць – асобамі, якія выконваюць іх абавязкі.

Прадстаўленне запаўняецца на беларускай мове, усе пазначаныя графы павінны быць запоўнены і змяшчаць дакладную інфармацыю, усебаковую ацэнку заслуг і дасягненняў работніка і накіроўваецца не пазней, чым за месяц да ўзнагароджання.

6. Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай узгадняецца з адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі галоўнага ўпраўлення па адукацыі.

7. Узнагароджанне Ганаровай граматай ажыццяўляецца на падставе загада начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі.

8. Работнікам устаноў адукацыі Мінскай вобласці, узнагароджаным Ганаровай граматай, выплачваецца грашовая прэмія ў памеры пяці базавых велічынь, дзяржаўным служачым – у памеры трох базавых велічынь.

Грашовая прэмія выплачваецца за кошт невыкарыстаных сродкаў, прадугледжаных на аплату працы, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Работнікам дзяржаўных органаў, устаноў адукацыі, прадпрыемстваў і арганізацый іншых ведамстваў выплачваецца аднаразовая грашовая прэмія за кошт сродкаў арганізацыі, якая хадайнічае аб узнагароджанні.

9. Ганаровая грамата ўручаецца начальнікам галоўнага ўпраўлення

па адукацыі, упаўнаважанымі ім асобамі, кіраўнікамі дзяржаўных органаў і арганізацый.

Ганаровая грамата ўручаецца асабіста работніку ва ўрачыстых абставінах.

Ганаровая грамата ўручаецца калектыву арганізацыі на ўрачыстым сходзе гэтага калектыву.

10. Запіс аб узнагароджанні Ганаровай граматай уносіцца ў працоўную кніжку работніка.

11. Персанальны ўлік работнікаў, якія ўзнагароджаны Ганаровай граматай, вядзецца сектарам арганізацыйна-кадравай работы галоўнага ўпраўлення па адукацыі і кадравымі службамі ўстаноў і арганізацый.

Дадатак 1

ПРАДСТАЎЛЕННЕ

да ўзнагароджання Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення
па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) Іванова Алена Пятроўна
2. Пасада служачага, месца працы (службы) настаўнік гісторыі дзяржаўнай установы адукацыі "....."
3. Чысло, месяц і год нараджэння 13.02.1982
4. Адукацыя 2004 год, установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
5. Вучоная ступень, вучонае званне не мае
6. Звесткі аб ранейшых узнагародах і дата ўзнагароджання Грамата Міністэрства адукацыі (20.02.2022), Ганаровая грамата галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама (15.05.2020)
7. Агульны стаж работы (службы) 20 гадоў
8. Стаж работы (службы) у дадзенай арганізацыі 15 гадоў
9. Характарыстыка з указаннем заслуг і дасягненняў

Іванова Алена Пятроўна .....

Дырэктар дзяржаўнай установы
адукацыі "....." А.І.Міхайлаў

Дата

М.П.

ЗАЦВЕРДЖАНА
загад начальніка галоўнага
ўпраўлення па адукацыі
Мінскага аблвыканкама
«07» 10 2026 № 525

ПАЛАЖЭННЕ
аб аб'яўленні Падзякі начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта

1. Падзяка начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (далей – Падзяка) - асобая форма ацэнкі і прызнання заслуг і дасягненняў у працоўнай, педагагічнай, навуковай, сацыяльна-культурнай, грамадскай і іншых відах дзейнасці калектываў і работнікаў устаноў адукацыі, органаў дзяржаўнага кіравання мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (далей – дзяржаўныя органы) і іншых прадпрыемстваў і арганізацый.

2. Падзяка аб'яўляецца за:

дасягненне асабліва высокіх вынікаў у працоўнай дзейнасці;

актыўны ўдзел у перспектыўных праектах, якія накіраваны на вырашэнне эканамічных, сацыяльных праблем і актуальных задач, якія стаяць перад сістэмай адукацыі;

выдатныя дасягненні ў арганізацыі і ўдасканаленні адукацыйнага працэсу, укараненне ў адукацыйны працэс новых тэхналогій навучання, сучасных формаў і метадаў арганізацыі і правядзення заняткаў, поспехі ў распрацоўцы вучэбнай і метадычнай літаратуры;

актыўную грамадзянскую і патрыятычную пазіцыю;

выкананне асабліва важных даручэнняў кіраўніцтва галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (далей – галоўнае ўпраўленне па адукацыі);

належную арганізацыю работы з грамадзянамі;

забеспячэнне вытворча-тэхналагічнай, выканаўчай і працоўнай дысцыпліны, стварэнне бяспечных умоў адукацыйнага працэсу;

за іншыя заслугі.

3. Рашэнне аб узнагароджанні Падзякай прымаецца начальнікам галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама (далей – начальнікам галоўнага ўпраўлення) на падставе прадстаўлення ўпраўленняў па адукацыі райвыканкамаў, упраўленняў (аддзела) па адукацыі і спорце райгарвыканкамаў, устаноў адукацыі абласнога падпарадкавання, органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый і ўстаноў іншых ведамстваў.

Узнагароджанне Падзякай можа ініцыяваць начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама, намеснікі начальніка,

начальнікі структурных падраздзяленняў галоўнага ўпраўлення па адукацыі.

Падзякай, як правіла, работнікі ўзнагароджваюцца не раней чым праз два гады з дня папярэдняга ўзнагароджання.

4. У галоўнае ўпраўленне па адукацыі накіроўваецца пісьмо на імя начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі з абгрунтаваннем неабходнасці ўзнагароджання, прадстаўленне згодна з Дадаткам 2. Пісьмо падпісваецца начальнікам упраўлення па адукацыі райвыканкама, упраўлення (аддзела) па адукацыі і спорце райгарвыканкама, кіраўніком установы адукацыі абласнога падпарадкавання, а ў іх адсутнасць – асобамі, якія выконваюць іх абавязкі.

Прадстаўленне запаўняецца на беларускай мове, усе пазначаныя графы павінны быць запоўнены і змяшчаць дакладную інфармацыю, усебаковую ацэнку заслуг і дасягненняў работніка і накіроўваецца не пазней, чым за месяц да ўзнагароджання.

5. Узнагароджанне Падзякай ажыццяўляецца на падставе загада начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама.

6. Узнагароджаным Падзякай выплачваецца грашовая прэмія ў памеры трох базавых велічынь.

Грашовая прэмія выплачваецца за кошт невыкарыстаных сродкаў, прадугледжаных на аплату працы, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Работнікам дзяржаўных органаў, устаноў адукацыі, прадпрыемстваў і арганізацый іншых ведамстваў выплачваецца аднаразовая грашовая прэмія за кошт сродкаў арганізацыі, якая хадайнічае аб узнагароджанні.

7. Працоўным калектывам арганізацый уручаецца толькі ліст аб аб'яўленні Падзякі на ўрачыстым сходзе ці пасяджэнні калектыву.

8. Падзяка з'яўляецца ўзнагародай, і адпаведны запіс уносіцца ў працоўную кніжку работніка.

9. Персанальны ўлік работнікаў і калектываў, якім аб'яўлена Падзяка, вядзецца сектарам арганізацыйна-кадравай работы галоўнага ўпраўлення па адукацыі і кадравымі службамі ўстаноў і арганізацый.

Дадатак 2

ПРАДСТАЎЛЕННЕ

да ўзнагароджання Падзякай начальніка галоўнага ўпраўлення
па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) (у назоўным і давальным склонах) Іванова Алена Пятроўна, Івановай Алене Пятроўне
2. Пасада служачага, месца працы (службы) настаўнік гісторыі дзяржаўнай установы адукацыі "....."
3. Чысло, месяц і год нараджэння 13.02.1982
4. Адукацыя 2004 год, установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
5. Вучоная ступень, вучонае званне не мае
6. Звесткі аб ранейшых узнагародах і дата ўзнагароджання Грамата Міністэрства адукацыі (20.02.2022), Ганаровая грамата галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама (15.05.2020)
7. Агульны стаж работы (службы) 20 гадоў
8. Стаж работы (службы) у дадзенай арганізацыі 15 гадоў
9. Характарыстыка з указаннем заслуг і дасягненняў

Іванова Алена Пятроўна .....

Дырэктар дзяржаўнай установы
адукацыі "....." А.І.Міхайлаў
Дата
М.П.